5. *Коротеев, А. Л.* Генезис образования специалистов духового исполнительского искусства Беларуси (народно-инструментального, профессионального и любительского) / А. Л. Коротеев // Музыкальное искусство и музыкальное образование на рубеже веков: материалы научных конференций «Беларусь и музыкальное наследие XX столетия: поиски и обретения» (29–30 нояб. 2001 г., Минск), «Музыкальное образование в контексте художественной культуры» (10–11 дек. 2002 г., Минск). – Вып. 1. – Минск, 2004. – С. 138–146.

6. *Коротеев, А. Л.* Мотивационные и аттестационно-квалификационные аспекты вузовской системы подготовки исполнителей на белорусских народных духовых музыкальных инструментах / А. Л. Коротеев // Высшая школа: проблемы и перспективы: материалы 6-й Международной научно-методической конф., Минск, 23–24 нояб. 2004 г. – Минск, 2004. – С. 165–166.

7. *Кашлев, С. С.* Понятие педагогического процесса [Педагогика: теория и практика педагогического процесса] / С. С. Кашлев // Народная асвета. – № 5, 2005. – С. 8–10.

8. *Кашлев, С. С.* Цель педагогического процесса [Педагогика: теория и практика педагогического процесса] / С. С. Кашлев // Народная асвета. – 2005. – № 7. – С. 23–26.

***У. Ф. Красюк,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры філасофіі*
*і метадалогіі гуманітарных навук*

## ДЗЕЙНАСЦЬ КРЭАТАРАЎ БЕЛАРУСКАГА АДРАДЖЭННЯ НА РУБЯЖЫ XIX–XX стст.

У айчыннай культураведчай традыцыі нацыянальнае Адраджэнне прынята падзяляць на некалькі этапаў. На першым этапе часоў Віленскага ўніверсітэта яго прафесары і студэнты, шляхта і святары ва ўмовах сумежжа польскай і беларускай культур распачыналі беларускую ідэю ў лібіральна-рамантычным кірунку. А ўжо на другім этапе, у апошняй чвэрці XIX ст. мае месца эвалюцыйны рух, зместам якога было выхаванне самасвядомасці народа, раскрыццё фальклорна-этнаграфічных каштоўнасцей, мовы, літаратуры і мастацтва. Узнікаюць аматарскія, а затым паступова і прафесіянальныя сацыяльна-культурныя структуры – суполкі, таварыствы, аб’яднанні. Актыўнасць крэатараў Адраджэння стала набываць мэтанакіраваны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

характар як жыццёвы выбар, яна адзначалася спецыялізацыяй дзейнасці і паступова стала набываць прафесійны змест.

Другая палова XIX – першыя гады XX ст. – перыяд зараджэння беларускай нацыянальнай прафесійнай культуры. Яна развівалася поруч з працэсам генезісу і развіцця нацыянальнай самасвядомасці. Першымі вестунамі прафесійнай творчасці на беларускай ніве былі этнаграфія, філалогія, фальклярыстыка. Выключную ролю мела адраджэнне беларускай літаратуры. Пазней сказалі сваё важкае слова выдавецтвы на беларускай мове, кніжныя таварыствы, легальныя органы беларускага друку. На хвалі літаратурнага жыцця ўзнікалі музычна-драматычныя гурткі, абуджаўся тэатральны рух. Беларуская культура прапагандавалася пасродкам арганізацыі творчых мерапрыемстваў, у гарадах і мястэчках ладзіліся «беларускія вечарыны», пашыралася кола вясковых гулянняў і батлейкі. Жыхары гарадоў і мястэчак мелі магчымасць далучацца да мастацкага жыцця, на выставах экспанаваліся творы тагачасных беларускіх мастакоў.

Зараджалася беларуская нацыянальная навука. У недалёкім мінулым, не маючы магчымасці тварыць ва ўлонні роднай культуры, многія навукоўцы з Беларусі аддавалі свой талент развіццю навукі другіх краін (дарэчы, гэта было адной з характэрных рысаў развіцця беларускай культуры, і нават шырэй – гісторыі). Згадаем хаця б І. Дамейку. Хаця ён і быў заснавальнікам фізіка-геаграфічнага раянавання Беларусі, Літвы, Польшчы, аднак увесь свой талент воляй лёсу аддаў развіццю чылійскай навукі.

Беларуская нацыянальная навука гэтага часу была пераважна гуманітарнай, у ёй вылучаліся тыя распрацоўкі, якія цесна звязаны с патрэбамі асэнсавання грамадскіх працэсаў; пачалі праводзіцца першыя нацыянальна вызначаныя гістарычныя даследаванні. На хвалі нацыянальнага адраджэння ва ўлонні галоўным чынам рэвалюцыйна-дэмакратычнай думкі развіваліся філасофскія ідэі, якія датычылі сацыяльных праблем, вольнадумства, пытанняў этыкі, эстэтыкі. Зараджалася сацыялагічнае вывучэнне шматлікіх сацыяльных праблем краю. У русле расійскай навукі пашыраліся даследаванні ў галіне прыродазнаўчых навук. Іх вынікі ўсё больш спалучаліся з практыкай жыцця. Гэта відавочна на прыкладзе навуковай дзейнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Я. А. Наркевіча-Ёдкі. Доктар медыцыны, прафесар, вучоны з еўрапейскім імем, ён імкнуўся данесці навуковыя веды да народа. У сваім маёнтку «Над-Нёманам» ён стварыў метэаралагічную станцыю, санаторый, ужываў перадавыя прыёмы лячэння людзей, намагаўся прымяняць адкрыцці ў галіне прыродазнаўства ў практычнай дзейнасці.

Нацыянальныя кадры прарасталі ў такіх прыродазнаўчых навуках, як аграномія, фізіялогія раслін, глебазнаўства, жывёлагадоўля. Гэта было звязана з дзейнасцю адной з першых у Еўропе і першай у Расійскай імперыі вышэйшай сельскагаспадарчай вучэбнай установы – Горы-Горацкага земляробчага інстытута. «Беларуская нацыянальная прафесійная культура і навука з'явіліся ў выніку кансалідацыі этнасу. У той час яны былі накіраваны на далейшае развіццё нацыянальнага працэсу і, у першую чаргу, на ўмацаванне этнічнай самасвядомасці» [4, с. 163].

Тым не меньш накладаў адбітак не лепшы ўзровень культурнага жыцця грамадства. Не толькі замардаваны цяжкай працай, галечай і сацыяльнай несправядлівасцю мужык, але і прадстаўнікі вышэйшых сацыяльных пластоў былі далёкія ад сапраўды культурнага ладу жыцця. Сучаснікі пакінулі даволі багатыя сведчанні аб сціплых культурных запатрабаваннях тагачаснага «панства». Слова «мяшчанства» набывала не сацыяльна-тэрытарыяльны сэнс, а маральны. Накладала адмоўны адбітак пыхлівая «сармацкасць», якая аддаляла занатта ганаровых шляхтюкоў ад «народу паспалітага». Духоўная нявызначанасць абумоўлівала тое, што мясцовы «свет» даволі абыякава ставіўся да лёсу культурнага быцця, развіцця ў ім нацыянальных тэндэнцый. Спаланізаваныя магнаты гэтай пары ўжо не нагадвалі самаахвярных наватараў развіцця беларускай культуры перыяду «залатога веку». Што датычыць мясцовых прадпрымальніцкіх пластоў, то тады «… толькі пачынала складвацца беларуская нацыя, і сярод буйной беларускай буржуазіі яшчэ мала хто цікавіўся гісторыяй і культурай роднага краю. Не маючы матэрыяльнай падтрымкі, амаль без сродкаў да існавання, тутэйшыя мастакі прыкладвалі вялікія намаганні, каб развіваць мастацтва на роднай зямлі. Яны ўвесь час адчувалі сябе «замежнікамі ў родным краі», бо мецэнаты падтрымлівалі і заахвочвалі толькі тое, што прыходзіла з-за мяжы» [2, с. 25].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тым не менш, страла гісторыі прабівала здранцвелыя кайданы затхлага асяроддзя. Ідэя нацыянальнага і сацыяльнага абуджэння няўмольна ўцягвала ў вадаварот грамадскіх падзей усё новыя пласты насельніцтва. Нягледзячы на паразу паўстання 1863 г., нацыянальна-вызваленчы рух не спыняўся. Больш таго, адметна ў гэтыя гады абвастрыліся пытанні: што значыць «тутэйшы край» і «тутэйшы народ»? У тую цяжкую пару набывала значнасць ідэя беларускай нацыі, ішоў працэс абуджэння нацыянальнай самасвядомасці, усведамлення самастойнасці беларускай нацыянальнай культуры. Гэта быў пераломны перыяд у гісторыі беларускай зямлі. «… На гэтым эканамічным пераломе адыходу польскага капіталу з Беларусі і наближэння надыходу расійскага – і адзначыўся крытычны момант у гістарычным жыцці Беларусі, калі ў асобе сваіх выдатнейшых прадстаўнікоў яна знайшла сама сябе» [3, с. 190].

Менавіта ў такую пераломную пару гэтыя прадстаўнікі і сталі пераходзіць ад шляхетскай нацыянальна не вызначанай рэвалюцыйнасці, стварэння рамантызаваных ідэалогій і вонкавай філантрапіі да дзейнасці прафесіянальнай, поўнасцю прысвячаць сябе асветніцкай рабоце па ўзвышэнню народнай культуры беларусаў на ўзровень прызнання яе ў якасці самастойнай культурнай з’явы, якая павінна займець пачэснае месца ў тагачаснай культурнай прасторы. Ужо рэвалюцыйнасць Кастуся Каліноўскага мела не стахастычны, сітуацыйны характар, а ўяўляла сабою асэнсаваны выбар жыцця, гэта ўжо быў прэцэдэнт прафесіянальнай справы.

Аднак пасля вызваленчага паўстання 1863 г., ва ўмовах мураўёўшчыны ды патапаўшчыны асноўная работа па прафесіяналізацыі беларускай справы выпала на інтэлігенцыю. Гэта быў ужо той гістарычны час, калі адбывалася спецыялізацыя ўсіх родаў дзейнасці ў грамадстве, бо капіталістычныя адносіны дыверсіфікавалі ўвесь лад жыцця. Складалася даволі неаднназначная сацыяльная группа, якая акумуліравала інтэлектуальную гронку духоўнага жыцця, прафесійна займалася разумовай працай. Складанае перапляценне нацыянальна-канфесійнага складу насельніцтва, адсутнасць на гэтую пару вышэйшых навучальных установ і як след – набыццё адукацыі за межамі Радзімы, знаходжанне на цывілізацыйным разломе – усё гэта абумовіла ідэйнае шматгалоссе інтэлігенцыі краю, сярод якой спакваля ўсё больш выразна праразалася беларуская рунь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На ніве набіраючага моц руху Адраджэння і фарміравалася беларуская інтэлігенцыя, якая ў XIX ст. усё больш зацвярджала сябе ў якасці інтэлектуальнага прадстаўніка і творчай сілы беларускага народа. Інтэлігенцыя як сацыяльная з'ява нібы праймала эстафету ад шляхты ў праве быць прадстаўніком пакуль яшчэ безгалосага народа ў грамадстве пры вырашэнні яго шматлікіх праблем. Станаўленне інтэлігенцыі Беларусі як творцы яе культуры – справа гістарычна складаная. «Рэвалюцыйны настрой, што ахапіў частку рускага дваранства пасля 1812 г., закрануў і Беларусь, даўшы штуршок росту нацыянальнай самасвядомасці інтэлігенцыі, якая была апалячана і акаталічана, і толькі паступова пачала выказваць сваю цікавасць да нацыянальнага жыцця беларускага народа» [1, с. 519]. Першапачаткова ўзнікшая з наступленнем XIX ст. інтэлігенцыя на беларускай зямлі была польска-беларускай па сваіх характарыстыках. Яе этнічна-канфесійную аснову складалі прадстаўнікі шляхты і мяшчанства каталіцкага веравызнання, аднак ва ўмовах патранажу праваслаўя з боку самадзяржаўя сталі мацней агучваць свае патрэбнасці і прадстаўнікі апошніх; ужо гоманаўцы былі выхадцамі з праваслаўнага мяшчанства, шляхты, духавенства.

Раней, на хвалі рамантызму з'явіўся той новы буйны атрад мясцовай прагрэсіўнай інтэлігенцыі, які да народа роднага краю, яго гісторыі і жыцця ставіўся як да свяйго спрадвечнага. Мясцовая інтэлігенцыя ва ўмовах выпрабаванняў шукала сваё прызначэнне. Многія яе таленавітыя прадстаўнікі не адыходзілі ад гістарычнай і духоўнай спадчыны свайго народа, адстойвалі ва ўмовах нацыянальнага прыгнёту сваю прыналежнасць да роднай зямлі. Яны вывучалі гістарычныя дакументы, збіралі народны фальклор, звычаі і адметнасці побыту беларусаў.

Перадавая частка беларускай інтэлігенцыі знаёмілася з этнаграфічным багаццем свайго народа, даследваннямі вучоных-фальклярыстаў, навуковымі публікацыямі па гісторыі Бацькаўшчыны. Яна не была ў баку ад сацыяльных рухаў і дзейнасці дэмакратычных і рэвалюцыйных арганізацый. Беларуская інтэлігенцыя пацярпела велізарныя ганенні з боку самадзяржаўя, прыняўшы актыўны ўдзел у паўстанні 1863 г. Частка яе была знішчана, частка выслана ў ссылку, многія вы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мушаны былі эмігрыраваць. Паўстанне 1863 г. спрыяла паступоваму адыходу дэмакратычнага слоя беларускай інтэлігенцыі ад паланізатарскіх колаў, садзейнічала ўспрыняццю больш адэкватных поглядаў на пытанне аб будучыні беларускага народа, у многім блізкіх да поглядаў рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў.

Пытанні адраджэння нацыянальнай культурнай спадчыны і дзейнасці крэатараў нацыянальнага руху з’яўляюцца актуальнымі справамі сучаснасці, патрабуюць неабходнай увагі і надаюць значнасць далейшым даследванням.


*1.* Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. / рэдкал. І. Ігнаценка (гал. рэд.) [і інш.]. – Навука і тэхніка, 1972–1975. – Т. 1 : Першабытны лад на тэрыторыі Беларусі. Эпоха феадалізму / К. Шабуня [і інш.]. – 1972. – 632 с., іл.

*2. Дробаў, А. І.* Графіка Беларусі XIX – пачатак XX стагоддзяў / А. І. Дробаў. – Мінск : Тэхналогія, 2000. – 67 с.

*3. Цьвікевіч, А.* «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. / А. Цьвікевіч. – 2-е выд. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.

*4.* Этнаграфія беларусаў / В. К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 215 с.



***В. В. Криштаносов,***
*соискатель ученой степени*
*кандидата наук*


# К ПРОБЛЕМЕ СТРУКТУРЫ КУЛЬТУРНЫХ ИНДУСТРИЙ В СОВРЕМЕННОМ КРЕАТИВНОМ ПРОСТРАНСТВЕ

Прежде чем приступить к вопросу о структурных особенностях культурной индустрии, необходимо отметить многообразие дефиниций, применяемых в данном дискурсе. Отчет Института статистики ЮНЕСКО за 2009 г. дает определение культурных индустрий как вида деятельности, ориентированного на массовое производство и распространение культурных продуктов. Зачастую культурные индустрии считаются частью креативных индустрий, притом, что «в некоторых местах есть ясная демаркация между культурными и креативными индустриями» [2]. На наш взгляд, исчерпывающее определение дает российский

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ